# 14 СТЭРЭАТЫП «ЖАНЧЫНЫ ДЗЕЙСНАЙ» У РАМАНЕ В.КОЎТУН «ПАКЛІКАНЫЯ»

1 Вобраз знакамітай палачанкі-асветніцы Ефрасінні ў рамане В.Коўтун «Пакліканыя». Свядомы выбар гераіні.

2 Неадназначнасць сэнсавай нагрузкі вобраза Вольгі ў рамане В.Коўтун. Супярэчлівасць характару гераіні.

## 1 Вобраз знакамітай палачанкі-асветніцы Ефрасінні ў рамане В.Коўтун «Пакліканыя». Свядомы выбар гераіні

В.Коўтун застаецца вернай сабе ў стварэнні мастацкай галерэі жаночых вобразаў – знакамітых жанчын нашай беларускай зямлі. На гэты раз яна па-мастацку асэнсоўвае вобраз больш аддаленай у часе, чым Цётка, палачанкі-асветніцы Еўфрасінні Полацкай. Так, крытыкі слушна заўважаюць, што раман В.Коўтун «Пакліканыя» «не прытрымліваецца строгіх канонаў жыццеапісальнага жанру». Але нас цікавіць якраз не жанравая спецыфіка твора. Мы прааналізуем стэрэатыпы жаноцкасці ў рамане, а больш дакладна, стэрэатып «жанчыны дзейснай», які прадстаўлены вобразам галоўнай гераіні. Нягледзячы на тое, што аўтарка прытрымліваецца «дакументальна занатаваных і агіяграфічных звестак», вобраз полацкай асветніцы суб’ектыўны і супярэчлівы. Гэта тычыцца найперш думак і перажыванняў галоўнай гераіні, яе ўнутранага свету, што больш шырока прадстаўлены ў рамане ў параўнанні са светам падзей.

З першых старонак твора перад чытачом паўстае вобраз ужо немаладой ігуменні Еўфрасінні, якая плыве на караблі з Канстанцінопаля ў Святую Зямлю, у Галілею. І ўжо тут аўтарка падкрэслівае, што жыццёвы шлях Еўфрасінні ўвогуле і падарожжа ў Галілею ў прыватнасці былі напоўнены неймавернымі цяжкасцямі, што выпадаюць на долю не кожнага чалавека, бо не кожны можа іх вытрымаць, пераадолець і тым больш узвысіцца над імі. Паралельна ў рамане падкрэсліваецца выключнасць галоўнай гераіні, яе выбранасць, «пакліканасць». Яна ў прарочым сне *«ўбачыла зверху на снезе яркую, як надломаная бліскавіца, дарогу. Змеціла на ёй і сябе...»*. Духоўныя сілы яе бязмежныя, нават шторм на моры (таксама незвычайны: *«І ўсе адразу зразумелі, што пачынаецца нечуваны дасюль на ўсёй Галілеі страшны шторм».*) полацкая ігуменне можа спыніць малітвай: *«Тады ўсе загайданыя штормам да паўсмерці – і бывалыя марскія ваўкі, і маладзенькія юнгі, і ацалелыя пасажыры з Канстанцінопаля – як бы апрытомнелі, адчуўшы Боскую літасць, падняліся наверх і нарэшце ўбачылі на палубе гэтых паніклых галовамі паломнікаў з Полацка»*.

Не сакрэт, што дарога – самы лепшы час для роздуму, успамінаў. Менавіта падчас падарожжа ў Святую Зямлю полацкая ігуменне ўзгадвае найбольш яркія моманты свайго жыцця. Адным з такіх успамінаў «раманнай» Еўфрасінні з’яўляецца сватанне княжыча-смаляніна, якое літаратуразнаўца Шынкарэнка В. ахарактарызавала наступным чынам: «Псіхалагічна абгрунтаваным у выбары далейшага жыццёвага шляху падаецца эпізод сватання Прадславы за прыгожага залатавалосага смаляніна. Ужо раней наважыўшыся служыць Богу, перакананая ў тым, што *«слава зямная, быццам попел, рассейваецца»*, дзяўчына разам з тым не можа не згадзіцца з развагамі жаніха і стаць міжвольнаю прычынай праліцця крыві паміж палачанскім і суседнім стальцамі. І калі гэтую хуткаімгненную – маладых людзей і астатніх прысутных – радасць перарывае нястрымны палёт здрадніцкай чырванадзюбай стралы, што скіравана ў самае сэрца найшчаслівейшага княжыча,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Прадслава моцна захварэе, адчуе ў душы вялікую і непапраўную страту. Гэта і яе дзявоцтва, яе маладосць працінае тая самая страла». З прыведзенай цытаты вынікае, што выбар Прадславы не столькі свядомы, колькі абумоўлены абставінамі, якім яна падпарадкоўваецца, выпадак, а не яе жаданне, воля. Замуж за смаляніна Прадслава збіраецца ісці таму, што не хоча быць прычынай праліцця «крыві зроднікаў». А ідзе ў манастыр па прычыне забойства жаніха, княжыча-смаляніна. Параўнаем: «Жыцие...» падкрэслівае менавіта свядомы выбар князёўны-палачанкі стаць Хрыстовай нявестай, пры гэтым не варта забываць што гэтага патрабавалі каноны жанру. Таму сёння цяжка ведаць напэўна, што ж сапраўды паўплывала на выбар Еўфрасінняй шляху служэння веры Хрыстовай. Застаецца незразумелым, чаму яна тады так доўга хварэе, чаму перапаўняе яе *«нязбытнае адчуванне вялікай страты»*. Можа, гэта вышэйшы знак, наканаванасць, лёс, пацверджанне боскай выбранасці, правільнасці абранага шляху? Ці гэта паказчык глыбокага пачуцця Прадславы да смаляніна?! Але чаму тады гераіня супраціўлялася гэтаму пачуццю? Ці можа быць шчаслівым чалавек, які падпарадкоўваецца толькі доўгу, ці можа ён зрабіць шчаслівымі тых, хто побач? Усе гэтыя пытанні ў пэўнай ступені аспрэчваюць «псіхалагічную абгрунтаванасць» выбару Прадславы. Гэты эпізод хутчэй блытае псіхалагічныя матывацыі, чым іх праясняе, ускладняе вобраз. Памкненні аўтаркі «ажывіць» гераіню, на наш погляд, не зусім удалыя. Тым больш, што да смерці княжыча-смаляніна, як разумее ачуняўшая Прадслава, спрычыніўся яе родны дзядзька Давыд (кіруючыся ці палітычнымі інтарэсамі, ці асабістымі пачуццямі да Прадславы – тэкст дазваляе разумець дваіста). Ва ўсякім выпадку «радасна-пажадлівы позірк» дзядзькі яна доўга адчувае на сабе.

З твора вынікае, што вызначальнымі ў лёсе галоўнай гераіні рамана з'яўляюцца абставіны, а не воля ці асабістыя жаданні. Адчуванне незавершанасці, недагаворанасці, шматзначнасці ўзнікае пры чытанні рамана, а гэта, на думку прадстаўнікоў феміністкага літаратурнага крытыцызму (Э.Сіксу), і ёсць адзнака «жаночага тэксту» ці «жаночага пісьма». Бо пісаць тэкст для жанчыны – значыць доўжыць сітуацыю незавершанасці і бясконцасці ў тэксце.

Многія ўчынкі Еўфрасінні ў рамане ўспрымаюцца неадназначна. Гэта тычыцца і наступнага эпізода. Маладая ігуменнія назірае разам з гараджанамі, як па Дзвіне сплываюць плыты з памерлымі ад чумы і голаду жыхарамі княства і воямі, што баранілі край ад «хана Баняка»: *«Дубовыя каўчэгі і плыты з мерцвякамі ўжо сплывалі за Полацк, знікаючы разам з крыгамі за тым выгінам ракі, дзе чарод па загаду вялікага князя павінны былі спыніць, каб пахаваць нябожчыкаў на старым капішчы»*. Еўфрасіння ў апошні момант, *«для сябе самой нечакана»*, апынулася ў стругу *«з князем Давыдам і святаром з Бельчыцаў»*. Што яе падштурхнула праводзіць у апошні шлях памерлых, калі не ёй гэта было даручана, а бельчыцкаму святару? Роля ігуменні? Покліч Усявышняга? Непаслушэнства? Імкненне быць у цэнтры падзей? Але чамусьці далейшае развіццё сюжэту прыводзіць да высновы, што кінулася яна ў струг з-за князя Давыда, які *«зноў працяў яе чорным, прыкра-пажадлівым позіркам»*, чый позірк яна ўвесь час памятала, але рабіла выгляд, што не заўважае, як і *«не пачула гэты* (князя Давыда – Т.Ф.) *перарывісты ад грахоўнае жарсці шэпт...»*. Такую неадназначнасць (ці алагічнасць) можна аднесці на рахунак аўтаркі рамана і ўвогуле «жаночага пісьма».

На нашу думку, не зусім апраўданы прыём В.Коўтун надаваць Еўфрасінні магчымасці і здольнасці большыя, чым былі ў яе прататыпа. Маецца на ўвазе здольнасць прарочыць і ацаляць, якую доўга не хацела прыкмячаць у сабе галоўная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

гераіня твора, а потым яшчэ доўга баялася ёю карыстацца. Гэта тычыцца і спынення малітвай ужо згаданага намі «нечуванага шторму», вылечвання князёўны Вольгі, лячэння хворых у Галілейскім шпіталі і інш. У рамане, на наш погляд, гіпербалізавана і палітычная роля Еўфрасінні. Актыўны ўдзел гераіні ва ўсіх палітычна значных падзеях Полацкага княства не раскрывае вобраз, не ўзвялічвае асобу Еўфрасінні як сапраўдную гістарычную, а, наадварот, стварае ўражанне штучнага ўмешвання ў плынь гісторыі, дадае негатыву вобразу. Быццам (насуперак пафаснаму сцвярджэнню полацкай ігуменні: *«Толькі пра Полацк і дбаю!»*) Еўфрасіння мела дачыненне да некаторых, так бы мовіць, «негатыўных момантаў» у гісторыі полацкай зямлі. Падкрэслім, гэта тычыцца толькі рамана, яго галоўнай гераіні і «раманнай гісторыі». Яе словы і некаторыя ўчынкі супярэчаць адно аднаму, выяўляюць яе амбіцыі, прэтэнзіі на адну з галоўных роляў не толькі ў культурным жыцці Полацка і ўсяго княства, а і ў палітычным (*«Міна, дачуўшыся, што Еўфрасіння пасля пахавання бельчыцкага святара нарэшце адужала, паклікаў у свае загарадныя харомы амаль усіх старшынаў полацкага веча – і князёў, і заможных гараджан, людзей служылых, і сваіх святароў. Асобнае запрашэнне, замацаванае пячаткаю, было прывезена Еўфрасінні. Тая, прачытаўшы, яшчэ не ведала, што сярод усяго гурту найслаўнейшых гасцей уладыкі ў тую раніцу яна будзе адзінаю жанчынай...»*), жаданне давесці сваё «я» нярэдка насуперак абставінам і просьбам. Прыкладам гэтага можа служыць урывак пра зварот да Еўфрасінні полацкіх баяраў з просьбай аддаць родную сястру Гардзіславу замуж у Ноўгарад. Быццам бы справядліва абараняючы асабістыя інтарэсы апошняй (а не палітычныя інтарэсы полацкіх баяр / Полацка) і яе права на выбар далейшага жыццёвага шляху, Еўфрасіння тым не менш не пытаецца ў сястры, чаго тая хоча, а адмаўляе баярам без яе ведама, бярэ на сябе адказнасць за лёс Гардзіславы: *«Пра сястру нашу, паслушніцу, у жаніха яе нябеснага запытайце. У Яго дазволу прасіце. Бо сама яна цяпер – у глыбокім посце маўчання»*. Безумоўна, пост маўчання сам па сабе сведчыць пра сталае рашэнне Гардзіславы. Але на памяць прыходзяць словы А.Лойкі пра «чорны фанатызм» Еўфрасінні, які праяўляўся ў жаданні пастрыгчы ў манахіні родную і стрыечную сясцёр, пляменніц і выяўляўся (згодна з «Жыціем») у словах «аз хощу пострищи». Паказальным у гэтым сэнсе з'яўляецца і наступны эпізод: *«А праз два гады ў Полацку зноў усё памянялася: Веча, паслухаўшы сяльцову ігуменню Еўфрасінню, нечакана перайначыла сваю думку. Адвярнуўшыся ад жорсткага Рогвалада, пракрычала вярнуць на дзяржаўны сталец менскага Глебавіча...»*.

На працягу твора неаднойчы падкрэсліваецца прыгажосць і сексуальнасць гераіні (дадзеныя «чорным анёлам» «чорныя вочы і вішнёва-прывабныя вусны»), акцэнтуецца ўвага на яе змаганні з жаданнямі плоці. Еўфрасінні-манашцы характэрны ўцёкі ад сексуальнасці і пастаяннае яе праяўленне ў рамане. Так, ва ўспамінах і снах ігуменні прысутнічае вобраз маладога валацужнага лучніка-гвалтаўніка, з якім яна сустрэлася ў «заслаўскім маленстве» на беразе Свіслачы, *«калі цэлы год навучалася грэцкай мове ў пісца Данілы»*. Пра пажадлівы погляд князя Давыда мы ўжо згадвалі. І напрыканцы жыцця баліць душа палачанкі за кмета Саву, які быў закаханы ў Еўфрасінню, і спачатку штовечар прыходзіў у Сяльцо быццам бы з мэтай паслухаць спевы сясцёр-манашак, на самой жа справе ўбачыць ігуменню. За што быў пераведзены ў смерды. Каб неяк змякчыць становішча былога старэйшага вартаўніка вязніцы кмета Савы, Еўфрасіння бярэ яго работнікам у манастыр. Суправаджаючы манахіню да князя Расціслава ў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Заслаўе, ужо «манах Сава» памірае ад удару нажа ўсё таго ж валацужнага лучніка, засланяючы сабою Еўфрасінню. Невядома адкуль з'явіўся лучнік праз гады на заслаўскай дарозе цёмнай дажджлівай ноччу і якраз у той час, як на ёй апынулася Еўфрасіння. Да ўсяго ігуменню спакушае сам д'ябал у выглядзе чорта. Імкненне В.Коўтун падкрэсліць у творы незвычайную сілу волі гераіні, уменне перамагаць уласныя слабасці зразумелыя. Аднак кідаецца ў вочы штучнасць такіх выпрабаванняў, «іншы раз падаецца, што не заўжды пры гэтым пісьменніцай вытрымліваецца мера эстэтычнага» (В.Шынкарэнка).

Варта звярнуць увагу і на самаадчуванне Еўфрасінні. Праз увесь раман яно перадаецца наступнымі словамі: *«зноў упала ў глыбокі сон», «нечакана моцна забалелі плечы», «балюча... зудзіць зашорганая цяжкай хламідаю спіна»*; *«сабраўшы апошнія сілы... паднялася», «ногі падкасіліся і яна зноў бяссіла асунулася на тапчан»*; *«ледзь ачуньвала пасля забойства смаляніна»*; *«паплыла ў бясконцае глухое бяспамяцтва», «амаль беспрытомная»*; *«зусім змогшыся», «нарэшце адужала»*; *«тады, бяссілая, апусцілася на лаву каля сцяны»*; *«ледзь трымаючы нямогласць, Еўфрасіння...»*; *«доўга, аслабелая, не магла падняцца на ногі»*; *«асунулася, белая, што царкоўная сцяна», «адчувала ва ўсім целе ламату і нямогласць»*; *«ледзь трываючы боль, паднялася на ногі»* і мн. інш. Жыццё праз пастаяннае пераадоленне болі і нямогласці. Цела, яго боль і адчуванні, пачуцці гераіні таксама прыкмета «жаночага пісьма». Гераіня здзяйсняе свой жыццёвы шлях пастаянна пераадольваючы цяжкасці, з неверагодным напружаннем волі. Калі ж яе выбар свядомы, то хіба нельга «несці свой крыж» з задавальненнем, з радасцю, дастойна, а не пераадольваючы сябе ўвесь час? Пытанне застаецца адкрытым...

**2 Неадназначнасць сэнсавай нагрузкі вобраза Вольгі ў рамане В.Коўтун. Супярэчлівасць характару гераінь.**

Раман В.Коўтун «Пакліканыя» прадстаўляе менш знакамітую, але не менш дзёрзкую, чым Еўфрасіння, князёўну Вольгу, дачку менскага князя Расціслава, пакліканага вечам на полацкі сталец. Апасродкаванае знаёмства з ёю адбываецца яшчэ ў першай кнізе рамана. На непрытомную дзяўчыну мы глядзім вачыма Еўфрасінні (*«Амаль пасярэдзіне яе* (каплічкі – Т.Ф.) *на засланай светлаю коўдраю шырокай лаве ляжала маладзенькая, гадоў дванаццаці, юніца ў доўгай, да самых пятаў, чорнай апратцы – княжая дачка. Здавалася – спіць»*), чуем пра яе ад бацькі. Пасля таго, як «суровая полацкая лекарка» Еўфрасіння сваімі малітвамі ацаліла Вольгу, яе перавозяць з заслаўскай капліцы ў менскі палац глебавічаў. Але яшчэ ў капліцы, ледзь апрытомнеўшы, яна зразумела, што не здольна больш размаўляць: *«Нечакана адчула, што не можа сказаць ані слова*]. Непасрэднае знаёмства з князёўнай і развіццё яе характару адбываецца ў другой кнізе рамана. Чарніца Вольга разам з цёткай-ігуменняй здзяйсняе паломніцтва ў «галоўны горад Святой зямлі». І таксама, як Еўфрасіння, «раскручвае сувой свайго жыцця».

Гэты супярэчлівы вобраз важны для вырашэння аўтарскай задумы твора. Неадназначнасць яго сэнсавай нагрузкі заключаецца ў тым, што пісьменніца, па-першае, рэпрэзентуе яшчэ адзін стэрэатып «жанчыны дзейснай», па-другое, – адлюстроўвае складанасць пераходу ад язычніцтва да хрысціянства, барацьбу пачуццяў у душы сярэдневяковага чалавека. Язычніцтва, з яго адухаўленнем прыроды, адчуваннем токаў жыцця ў творы супрацьпастаўляецца хрысціянству. Зварот да хрысціянства прыносіў Вользе немату, якая пачала праяўляцца пасля

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

смерці маці, але разам з тым фізічнае выздараўленне. Вяртанне да язычніцтва – голас, магчымасць гаварыць, чуць і разумець усе галасы і зрухі прыроды, але пры гэтым быць хворай на цела. Выбар не з лёгкіх! Тым больш, што ён ускладнены ў рамане інтымнымі адносінамі Вольгі з вешчуном Валодшам. Для яе развітацца з язычніцтвам – значыць страціць каханага. Зразумела, чаму Валодша раіць Вользе атруціць Еўфрасінню, пазбавіць жыцця за тое, што яна *«выцягнула з цябе* (Вольгі – Т.Ф.) *жыццё. Ты ўжо забыла, што мы з табою некалі ўсё чулі і бачылі! Усё было нашым...»*. Вяшчун падае Вользе «невялікую сярэбраную бонку на ланцужку», у якой знаходзілася «чорная гарошына атруты». Гэта своеасаблівае змаганне вешчуна і за веру, і за каханую, якой урэшце ён здраджвае, але, як відаць з тэксту, не пазбаўляецца свайго пачуцця.

Як вядома, Еўфрасіння далёка не адзіная з роду Усяслава Чарадзея, хто стала служкаю Хрыста. Так, у «Жыціі» адзначаецца, што ў справе асветніцтва і распаўсюджвання хрысціянства ёй дапамагалі родная і стрыечная сёстры, пляменніцы. А таксама і тое, што полацкая ігумення была за павольны (шляхам навучання і пераканання), а не гвалтоўны пераход да хрысціянства. Пацверджанне гэтаму ў рамане «Пакліканыя» – лаяльнае стаўленне Еўфрасінні да ўчынкаў Вольгі, вялікая цярплівасць у дасягненні мэты, пра што сведчыць наказ Расціславу: *«...Прачнецца, будзе служкай Хрыстоваю. Так наканавана. Але не прымушай і сілаю ад паганскіх ігрышчаў не адцягвай. Сама адвернецца»*. Сімвалічны і ўзрост, у якім звярнулася да бога Вольга – ёй таксама, як і Еўфрасінні, было 12 гадоў.

Ачунялая Вольга з пакаёўкай Маўрай (пасля таго, як Расціслаў з дружынаю выехаў у Полацак) наведвае далёкае таемнае перунова капішча ў пушчы. Тут яна разумее, што не чуе многае з таго, што раней чула: *«Быццам полацкая лекарка выняла з яе хворага цела не страшную пухліну, а нешта зусім іншае, тое, што яшчэ з маленства нябачнымі, але такімі моцнымі повязямі лучыла князёўну з жывым духам усёй мянескай зямлі»*. Страх і сумненні ахопліваюць яе душу, яна вагаецца ў выбары веры. У такія моманты менскай князёўне будзе з'яўляцца вобраз полацкай ігуменні, гучаць яе голас. Так, напрыклад, адбываецца падчас танцаў у карагодзе ля паганскага вогнішча, у якіх удзельнічае і Вольга: *«Успыхнула бліскавіца, высвеціўшы ў цемры прадаўгаватае, атуленае белым манаскім каптуром танкабровае аблічча полацкай манашкі»*. Еўфрасіння будзе з'яўляцца ёй і надалей, як агеньчык у цемры, як адзінаправільны шлях. Так адбылося і падчас пераходу броду пры пошуках Валодшы: *«Прыжмурыўшы павекі, Вольга яскрава ўявіла жоўты язычок вялікай свечкі пад абразамі. З начной глыбіні на яе, здаецца, зірнула сама полацкая ігумення»*.

Канчатковы пераход мінскай князёўны ў хрысціянства адбыўся, як вынікае з тэксту, дзякуючы «разрыву» з Валодшам – пасля яго здрады Вользе з пакаёўкай Маўрай. Князёўна ў парыве роспачы падпарадкоўваецца неўтаймоўнаму пачуццю рэўнасці, якое нават не ў стане кантраляваць. Яна жадае адпомсціць ці хаця б зрабіць балюча каханаму, таму спрабуе самастойна знішчыць перуна: *«Пад'ехаўшы да перуна бліжэй, выхапіла меч і гнеўна апусціла яго на бліскуча затлушчаную галаву. Але жалезнае лязо толькі слізганула па скамянелым дрэве»*. Калі ў яе гэта не атрымліваецца, Вольга загадвае зруйнаваць капішча і самога ідала кметам. Але і гэтага ёй мала. Пачуццё рэўнасці штурхае Вольгу на злачынства ў адносінах да пакаёўкі. Князёўна загадвае дзесяцкаму ў прысутнасці кметаў і смердаў згвалціць Маўру, быццам за тое, што яна адмовілася прыняць з рук Вольгі крыж. На самой справе гэта помста за Валодшу, за сваё няспраўджанае каханне. Яна прымушае і

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўсіх смердаў прыняць *«простыя, толькі што перавязаныя папаратнікам крыжы»*. Хаця сама яшчэ, так бы мовіць, афіцыйна не прыняла хрысціянства (Еўфрасіння дае час Вользе на прыняцце рашэння ў адносінах веры, апошняя ж гвалтам прымушае смердаў змяніць веру). Сцэна пра руйнаванне паганскага капішча – яшчэ адзін літаратурны прыклад прымусовага насаджэння веры, калі «правільнасць» веры апраўдвае жорсткасць і насілле. Што наўрад ці можа быць прынята перш за ўсё з пункту гледжання хрысціянскіх традыцый.

Перад тым як нішчыць паганскае капішча, менская князёўна «паласуе» дзявочую вопратку, абстрыгае свае валасы, пераапранаецца ў *«скураныя ваярскія нагавіцы і старую драцяную сарочку з шырокімі бліскучымі наплечнікамі»*, – такім чынам парываючы з жаноцкасцю ў сабе, прынамсі, знешняй. Магчыма і са сваёй слабасцю – каханнем да Валодшы. З усяго вышэй сказанага можна зрабіць выснову, што Вольга прымае рашэнне стаць хрысціянкай не па перакананню, а з-за няспраўджанасці кахання, расчараванасці ў каханым. На светапогляд жанчыны ўплываюць пачуцці, адносіны паміж поламі – такі традыцыйны погляд на жанчыну прысутнічае ў рамане паралельна аспрэчванню менавіта традыцыйнай жаноцкасці.

Пасля «расправы» над ідалам Вольга апынулася ў заслаўскай капліцы, куды яе, узрушаную і стомленую, прывёз конь па мянушцы Сыч. Там яна просіць Маці Божую даравань ёй усе грахі. Там яна знаходзіць супакаенне і ўпэўненасць у правільнасці выбару, адчувае Боскую любоў, міласць і ўсёдаравальнасць: *«Прыгледзелася: па светлым ліку нябеснай Царыцы каціліся слёзы»*. Але чамусьці Вольга едзе ў Полацк па загаду бацькі, а не па сваёй волі: *«... Дачуўшыся пра вяртанне Вольгі да ваярскага занятку, праз пасланца гнеўна паклікаў дачку да сябе, замацаваўшы важкае слова тоўстай пячаткай»*. Яе селяць спачатку ў скрыпторыі, а пасля заканчэння будаўніцтва манастырскага будынка – у келлі. Той факт, што Вольга захоўвае «драцяную сарочку з грубымі нагавіцамі і шалом з брамніцаю», сведчыць пра хісткасць перакананняў, няскоранасць мінскай князёўны, пра яе асабістыя планы на далейшае жыццё. Пакорлівасць яе толькі знешняя. Тут, у манастыры, яе насцігае запозненае шкадаванне аб страчаным каханні, жаданне ўбачыцца з Валодшам. Але зноў жа супярэчаць логіцы развіцця характару гераіні яе наступныя ўчынкі. Убачыўшы выпадкова ў Сяльцы сярод прыезджых рыбакоў «вялікага калматага смерда, які нагадаў Валодшу», Вольга, пры ўсёй сваёй нястрымнасці ў характары, самоце і скрусе аб каханым, не наважваецца шукаць яго, не хоча ўпэўніцца, што гэта ён на самой справе ці, наадварот, яна памыляецца і гатова ва ўсіх бачыць Валодшу, што ў сваю чаргу падкрэслівае моц пачуцця. Чаму? У тэксце гэта тлумачыцца тым, што *«зіркасты манастыр, молячыся да самай раніцы, не спускаў з яе зацікаўленых позіркаў»*. Але Вольга дапускала і будзе дапускаць, як сведчыць тэкст,  большыя вольнасці, адна вырашаючы, што ёй патрэбна рабіць, не раіцца і не аглядваецца ні на бацьку, ні на Еўфрасінню, ні тым больш на манастырскіх сясцёр. Яе далейшае жыццё багатае на незвычайныя прыгоды і таямніцы. Аргумент пра «зіркасты манастыр» не апраўданы логікай развіцця сюжэту і характару гераіні.

Даведаўшыся аб пагрозе бацьку (год 1159: веча адказвае Расціславу «Не хочам цябе!»), Вольга зноў апранае мужчынскае / ваярскае адзенне. А, назіраючы сцэну, як «дурнік Яміна» працягвае ігуменні келіх з мядовым напоем, яна разумее, што напой атручаны (бо раней заўважыла знікненне «чорнай гарошыны») і рассякае келіх «кароткім мечам», чым выратоўвае жыццё Еўфрасінні. Пасля гэтага ўчынку Вольга-вой, *«нібы прывід, стапнеў за плячыма агромністага збою гасцей»*.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Расціслаў, пасля перамогі Рогвалада ў супрацьстаянні князёў, пад аховай маленькага атрада, паімчаў у бок Менска. У гэты час да князя-пераможцы *«з шэрагу смердаў... з радасным енкам нечакана вылецеў... заслаўскі вяшчун Валодша... Рогвалад, імкліва выхапіўшы меч, ярасна праткнуў грудзі няшчаснага. З боку дрыгавіцкай варты пачуўся балючы дзявочы ўскрык»*. Адбываецца гульня ў «кошкі-мышкі». Вольга не імкнецца наладзіць сувязі з Валодшам, тым не менш вельмі балюча ўспрымае яго забойства і знікае. Вышукі бацькі не даюць станоўчых вынікаў: *«Усё паказвала на тое, што менеская князёўна з абсягаў полацкай зямлі знікла»*. На самой справе вяшчун толькі параненны, яго выхадзіць Еўфрасіння, якая ледзь не была атручаная дзякуючы яму. Адносіны паміж Валодшам і Вольгай яшчэ будуць мець свой працяг.

Праз два гады веча ў Полацку зноў пракрычала за Расціслава Глебавіча. А яшчэ праз год знаходзіцца і Вольга. Яна была соцкім купецкай варты ў багатых жмудзінаў з Герсікі. Менская князёўна згодна жыць у манастыры, але не хоча апранаць «манаскі покрыў». Тады ігуменнія Еўфрасіння прапаноўвае ёй службу ў варце манастыра – Вольга з радасцю згаджаецца. І атрымлівае загад ісці з сёстрамі па мох для прытулку, у якім будуць утрымлівацца немаўляты. У лесе яна ў апошні раз сустрэнецца з Валодшам. Ён заслоніць сабою Вольгу ад ваўчыцы, што, абараняючы ваўчанят, нападзе на менскую князёўну, і загіне. Адкуль і па якой прычыне Валодша апынуўся ў лесе, невядома. Матывацыя ўчынкаў герояў рамана па-ранейшаму часта адсутнічае. Звяртае на сябе ўвагу і перарывістасць, нацягнутасць сюжэту рамана.

Адносна вобраза Вольгі варта адзначыць наступнае: гераіня больш рашучая ў праяўленнях «мужчынскіх» учынкаў (знешне выяўленых) – руйнаванне капішча, служба соцкім купецкай варты і служба ў варце манастыра, ратаванне Еўфрасінні ад атруты і г.д.; менш рашучая яна ў праяўленнях «жаночых», унутраных учынкаў (у прызнанні сваіх пачуццяў, у іх выяўленні; адбываецца падмена матывацыі, так званыя «двайстыя стандарты»). Пазбягае вырашаць адносіны з каханым мужчынам, што сведчыць пра ўнутраныя комплексы гераіні, а, на наш погляд, нават і я-гераіні, калі мець на ўвазе менавіта ўнутраны свет гераінь, а не падзейны план твора.

Апошні, трэці, раздзел другой кнігі рамана «Пакліканыя» прадстаўляе сцішаную, пакорлівую, самаахвярную, адданую веры Хрыстовай Вольгу. Падчас паломніцтва ў вечны горад Іерусалім яна ратуе ўжо немаладую полацкую ігуменню, якую ўкусіла змяя. Вольга высмактала яд з далоні Еўфрасінні і, як відаць з твора, павінна памерці. Яна ўсё часцей чуе голас памерлага язычніцкага вешчуна Валодшы. Двухсэнсоўнасць дадзенага эпізода відавочная: Валодша тут выступае і сімвалам моцнага, але няспраўджанага даўняга кахання, і сімвалам язычніцтва, памяць аб якім не згасла ў душы Вольгі.

**Супярэчлівасць характараў** галоўных гераінь рамана В.Коўтун «Пакліканыя», што праглядваецца на працягу ўсяго твора, вынікае найперш з супярэчлівасці чалавечага характару наогул, і, да ўсяго, выяўляе жыццёвыя прыярытэты самой пісьменніцы.

Так, Еўфрасіння прадстаўлена ў творы не шчаслівай жанчынай, якая здолела спланаваць і пабудаваць сваё жыццё такім, як хацела, а пакутніцай (варта ўспомніць апісанні самаадчування полацкай ігуменні, якія ўжо прыводзіліся вышэй). На наш погляд, яе вобраз неапраўдана драматызаваны. Гераіня бярэ на сябе адказнаць большую, чым варта браць аднаму, няхай нават і геніяльнаму чалавеку. Дар прарочыць і ацаляць, якім надзяляе сваю гераіню В.Коўтун, таксама

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выкарыстоўваецца Еўфрасінняй непаслядоўна. Яна можа прадбачыць (праз відзежы) маштабныя, як правіла жахлівыя, падзеі для Полаччыны. «Нязначныя» ж – не, як у выпадку са смерцю Савы. І атрымліваецца, што ігумення неапраўдана губляе самых блізкіх і дарагіх ёй людзей. Лечыць хворыя душы і целы многім, але не ў стане хутка прывесці да псіхалагічнай раўнавагі сябе.

«Раманнай» Еўфрасінні характэрна палітычная і грамадская актыўнасць, нават дзёрзкасць і разам з тым нерашучасць у вырашэнні асабістых праблем, а таксама скрытнасць, ізаляванасць, адсутнасць сяброў, блізкіх адносін хоць з адным героем твора. У яе жыцці значную ролю адыгрывае выпадак.

Некаторае са сказанага пра характар Еўфрасінні, можна перанесці і на вобраз Вольгі. Рашучасць і пасіўнасць на роўных сумяшчаюцца ў яе характары. Афектыўнасць, як адзнака «жаночага пісьма», што праяўляецца ў сентыментальнасці, слязлівасці характэрна для вобраза мянескай княжны. У ёй усё яшчэ жыве язычніца, якая адчувае прыроду і жыве з ёй адным жыццём і разам з тым гераіня цягнецца да хрысціянства. Барацьба паміж язычніцтвам і хрысціянствам у душы Вольгі працягваецца праз увесь твор. З аднаго боку – гэта супярэчыць логіцы і ідэі рамана. З другога – можа быць цалкам апраўдана і вельмі рэалістычна, бо язычніцкія вераванні на Беларусі даволі моцныя і на пачатку трэцяга тысячагоддзя. Адным з яркіх прыкладаў такой супярэчлівасці характару Вольгі ў творы з'яўляецца жаданне атруціць Еўфрасінню, з якім яна едзе з Менску ў Полацк*: «Князёўна дасюль вінавацiла полацкую ігуменню і ў сваёй немаце, і ў тым, што слых у яе прападае ўсё часцей»*. (Хаця перад гэтым шчыра моліцца Маці Божай у заслаўскай капліцы і просіць аб даравані ўсіх грахоў). А ў выніку – выратоўвае Еўфрасінню, не дапускае, каб тая выпіла атручанае віно.

У душы Вольгі, як два бакі аднаго медаля, адначасна жыве жорсткасць да людзей – смердаў, суперніцы Маўры (нават да сябе самой) – і невераемная жаласць да ўсяго жывога – пароснай вепручыхі, якую ўпаляваў Валодша (*«І тады Вольга ўбачыла. І закрычала: Валодша гнаў у яміну тоўстую саміцу. Цяпер, калі ўжо не было высокай травы балота, адразу ж стала відаць, што гэта вялізная старая свіння»*); рыбы, што ловяць для манастырскага свята (*«З усяе моцы падцягваючы вяроўку, Вольга штохвіліны адчувала, як там, на другім канцы сеткі, у Палаце клубіцца, вірує і тузае свой ніцяны нерат схопленае з усіх бакоў рачное жыхарства... Ледзьве трымаючыся на нагах, захліснутая невераемнай жаласцю да ўсіх гэтых забраных у палон рачных насельнікаў, Вольга амаль не расчапіла пальцы. Але тут жа адчула спінаю недаверліва строгія позіркі сёстраў»*). Рашучасць у дзеяннях і пастаяннае «аглядванне» на манастырскіх сясцёр, адзінота – усё гэта праяўленні характару Вольгі.

Воля, рашучасць як якасці характару Вольгі бясследна знікаюць перад Валодшам. Можа таму яна яго пазбягае? Князёўна бязвольная, падатлівая, бездапаможная, пакорлівая перад вешчуном: *«А ён, рэзка ступіўшы наперад, нечакана схапіў яе за плечы. Бясцямна зваліў, кінуўшы на лапнік. Груба і ўладна, як палонніцу. Запрагнуў»*. Тут дарэчы ўзгадваюцца, супярэчлівыя на наш погляд, але слушныя для дадзенага тэксту высновы С. дэ Бавуар наконт таго, што жанчына хоча быць скоранай ноччу і непакорлівай днём, таму ёй дрэнна ўдаецца і першае, і другое.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ